**Водзыў на аўтарэферат**

дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны "Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Дысертацыя Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны ўяўляе лінгвістычны аналіз катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. В. Гніламёдава, змяшчае шэраг важных практычных распрацовак і назіранняў, а таксама тэарэтычных палажэнняў агульналінгвістычнага характару.

Актуальнасць падобнага даследавання не выклікае сумненняў, паколькі даследаванне мастацкага тэксту, асаблівасцей яго часавай арганізацыі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у лінгвістыцы. Такі аналіз дазваляе вызначыць моўную рэпрэзентацыю катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах мастацкай літаратуры.

Навуковая навізна і значнасць даследавання заключаецца ў тым, што саіскальнік распрацаваў метадалогію даследавання праспекцыі і рэтраспекцыі, выявіў усе магчымыя тыпы, віды аналізуемых катэгорый, адносіны паміж узаемаабумоўленымі праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі структурамі, значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных кампанентаў, апісаў прыёмы рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі, а таксама стварыў рэпрэзентатыўны корпус часавых форм дыскантыннума ў раманах У.В.Гніламёдава.

Хочацца адзначыць, што моўная рэпрэзентацыя і структурная арганізацыя праспекцыі і рэтраспекцыі ў рабоце прадстаўлены выразна і кваліфікавана.

Дысертацыйнае даследаванне Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны садзейнічае ўніфікацыі комплексу новых аб'ектыўных і сістэматызаваных

ведаў аб катэгорыях праспекцыі і рэтраспекцыі, іх структурнай і семантычнай арганізацыі, заканамернасцях функцыянавання. Палажэнні, якія выносяцца на абарону, характарызуюцца дакладнасцю, лагічнасцю пабудовы, карэлююць з задачамі і вынікамі даследавання. Заключэнне ўключае ўвесь таксанамічны клас праспекцыі і рэтраспекцыі, спосабы моўнага выражэння аналізуемых катэгрый.

Улічваючы актуальнасць даследавання, яго навізну і значнасць, высокі ўзровень выканання, лічым, што Дзігадзюк Валянціна Паўлаўна заслугоўвае прысваення ёй вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Загадчык кафедры рускай мовы
і культуры маўлення
ўстановы адукацыі "Ваенная акадэмія
Рэспублікі Беларусь",
кандыдат філалагічных навук, дацэнт С.С.Харанека

22.09.2023